**І.Б.Багачова**, *дацэнт*

# АДУКАЦЫЙНЫЯ СТАНДАРТЫ Ў КАНТЭКСЦЕ РЭФОРМЫ АДУКАЦЫІ

Некалькі гадоў таму назад не было аб'ектыўнай патрэбнасці ў распрацоўцы стандартаў мастацкай адукацыі, бо ў той час стандарт для ўсіх рэспублік і рэгіёнаў былога СССР існаваў агульны і абавязковы.

Гістарычна склалася так, што ў савецкі перыяд дзяржаўная палітыка ў галіне адукацыі была накіравана на стварэнне адзіных патрабаванняў да структуры і зместу вышэйшай мастацкай адукацыі, а таксама ўзроўню падрыхтоўкі выпускнікоў вышэйшых навучальных устаноў. Гэта распаўсюджвалася на ўсю адукацыйную прастору ранейшага СССР. Тэарэтычным грунтам патрабаванняў і базісам адукацыйных стандартаў з'яўляліся наступныя нарматыўныя дакументы: пералік спецыяльнасцей вышэйшай адукацыі; тыпавыя вучэбныя праграмы дысцыплін вучэбнага плана; тыпавое палажэнне аб вышэйшай навучальнай установе (статут вышэйшай навучальнай установы).

Пачатак 90-х гадоў, што вызначаўся важнымі зменамі сацыяльна-культурнай сітуацыі, выклікаў рэфармаванне сістэмы адукацыі.

Эфектыўнасць і інтэнсіўнасць, канкурэнцыя і падсправаздачнасць, паказчыкі дзейнасці — толькі некалькі ключавых слоў, якія пераважаюць у сучаснай дыскусіі аб будучыні вышэйшай адукацыі.

Спасылаючыся на міжнародныя даследаванні, можна вылучыць дзве розныя стратэгіі рэфармавання сістэмы адукацыі. Першая з іх прадугледжвае змену сістэмы і замену яе рыначнай. Другая мае на ўвазе захаванне сістэмы з меншай дзяржаўнай каардынацыяй і большай інстытуцыйнай аўтаноміяй.

Нацыянальная сістэма адукацыі абрала іншую мадэль: пайшла па шляху стварэння гнуткай, эфектыўнай,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

канкурэнтаздольнай, разнастайнай і высокадыферэнцыраванай сістэмы.

Гэта патрабавала перагляду структурных асноў адукацыі, яе зместавага боку і выклікала неабходнасць стварэння новых нарматыўных дакументаў, за аснову якіх можна было прыняць праект стандарта Рэспублікі Беларусь "Нацыянальная сістэма адукацыі Рэспублікі Беларусь. Сістэма стандартаў у галіне адукацыі. Асноўныя палажэнні". Гэты дакумент вызначае ролю, структуру і змест сістэмы стандартаў у галіне адукацыі Рэспублікі Беларусь. У яго ўключаецца паняцце адукацыйнага стандарта, які пашыраецца на ўсе звёны сістэмы адукацыі, у тым ліку вышэйшую прафесійную адукацыю.

Фарміраванне адукацыйных стандартаў з'яўляецца адной з галоўных мэт сусветнай адукацыйнай сістэмы. Гэта пацвярджаецца акцэнтамі, зробленымі ў дакладзе экспертаў ЮНЕСКА "Аб супярэчнасцях у галіне адукацыі ў свеце за 1993 г.". Спецыялісты прыйшлі да высновы аб тым, што важнасць праблемы стандартызацыі адукацыі патрабуе вылучэння гэтага пытання ў асобны раздзел.

На першы погляд, вырашэнне праблемы стандартызацыі вышэйшай адукацыі выклікана забеспячэннем прызнання сусветнай адукацыйнай сістэмай дыпломаў і сертыфікатаў аб адукацыі і ўзроўні падрыхтоўкі, выдадзеных у Беларусі. Разам з тым прызнанне дыпломаў і сертыфікатаў аб адукацыі з'яўляецца толькі адной з задач стандартызацыі. Стандартызацыя адукацыі абапіраецца на гэтак званую ідэалогію кіравання якасцю. Апошняя становіцца вядучай у кіраванні грамадствам і асобнымі арганізацыямі ва ўсіх краінах свету, асабліва развітых. Паступовa сфарміраваліся філасофія і метадалогія агульнага кіравання якасцю. Гэта пацвярджаюць матэрыялы апошняга Кангрэса ЕОК у Бруселі (1994), праграмныя дакументы ЮНЕСКА "Рэформа і развіццё вышэйшай адукацыі". У названых дакументах якасць адукацыі сувымерная з адным з галоўных напрамкаў вышэйшай адукацыі. Ён разглядаецца як шматбаковая

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

канцэпцыя, што ахоплівае ўсе асноўныя функцыі і віды дзейнасці ў адносінах да вышэйшай адукацыі.

Сусветны вопыт сведчыць аб тым, што кіраванне якасцю ажыццяўляецца на падставе вылучэння трох асноўных блокаў функцый:

1) фарміравання стратэгіі кіравання якасцю (пастаноўкі мэты, прагназіравання, планавання або праграміравання, стандартызацыі, нарміравання);

2) па рэалізацыі стратэгіі кіравання, каардынацыі, забеспячэння;

3) зваротнай сувязі (кантролю, выпрабаванняў, аналізу, уліку і справаздачнасці, ацэнкі).

У гэтым закладзены неабходныя перадумовы, што вядуць да стварэння новых адукацыйных стандартаў якасці адукацыі. Такім чынам, кіраванне якасцю адукацыі ў дзяржаўным плане павінна выходзіць на ўзровень нацыянальнай сістэмы і з'яўляцца часткай дзяржаўнай адукацыйнай палітыкі.

Безумоўна, якасць адукацыі павінна адпавядаць накірунку комплексных задач, што паўстаюць перад нацыянальнай сістэмай мастацкай адукацыі. Якасць адукацыі мусіць адпавядаць патрабаванням і сацыяльным нормам (стандартам).

Вылучаюць два віды ўзаемазвязаных і ўзаемадапаўняльных патрабаванняў, якія прад'яўляюцца да якасці адукацыі: з боку грамадства, дзяржавы і асобы.

Паняцце стандарта (ад англ. standart – норма, узор, мерка, аснова) прыйшло ў педагогіку нядаўна. Ідэолагі стандартызацыі вылучаюць жорсткую і мяккую стандартызацыю. Пад першай з іх разумеюць сістэму дзяржаўных стандартаў у тэхніка-тэхналагічнай і вытворчай сферах. Мяккая стандартызацыя звязана з паняццем упарадкавання, што мае дачыненне пераважна да гуманітарнай сферы.

У адрозненне ад тэхнічных адукацыйны стандарт уключае адзіную аснову адукацыі, на базе якой вызначаюцца яе розныя ўзроўні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Стандарт у сферы адукацыі — дзяржаўная норма адукаванасці, што змяшчае патрабаванні да структуры, адукацыйнай сістэмы і зместу адукацыі, узроўню засваення зместу адукацыі, формаў вымярэння і ацэнкі вынікаў вучэбнага працэсу.

У падобным кантэксце разуменне нормы якасці адукацыі звязана з уяўленнем аб норме не як фактары, што стрымлівае развіццё адукацыі, а як дынамічнай форме, што перыядычна абнаўляецца і фіксуецца ў выглядзе новых патрабаванняў.

Такім чынам, адукацыйны стандарт — фармалізаваная адукацыйная норма якасці, што замацоўваецца ў нарматыўным дакуменце і мае прававы статус.

Сучасны стандарт вышэйшай прафесійнай адукацыі ўключае наступныя часткі:

1. Дзяржаўны адукацыйны стандарт "Агульныя патрабаванні" (Агульны стандарт верхняга ўзроўню).

2. Дзяржаўны адукацыйны стандарт "Класіфікатар накірункаў і спецыяльнасцей вышэйшай прафесійнай адукацыі" (Спецыялізаваны стандарт).

3. Дзяржаўны адукацыйны стандарт "Дзяржаўныя патрабаванні да мінімуму зместу і ўзроўню падрыхтоўкі выпускнікоў" (Прыватны стандарт), што ўключае вучэбны план, праграмы вучэбных дысцыплін і курсаў, праграмы вучэбных і вытворчых практык, праграму (праграмы) выніковай атэстацыі.

На цяперашнім этапе развіцця адукацыі працэс стандартызацыі мае дзве мэты:

1) захаванне адзінай адукацыйнай прасторы на тэрыторыі рэспублікі;

2) стварэнне ўмоў дзеля таго, каб кожны студэнт атрымаў такую прафесійную падрыхтоўку, якая адпавядала б яго індывідуальнаму выбару.

Галоўная задача стандартызацыі заключаецца ў сістэматызацыі зместу адукацыі. Адной з важнейшых мэт адукацыйнага стандарта з'яўляецца развіццё якаснага фактару вышэйшай мастацкай адукацыі. Узрастае роля

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вышэйшай школы як транслятара культуры. Гаворка тут ідзе аб фарміраванні "чалавека культуры" і "чалавека ў культуры", г.зн. сінтэзе культуры і адукацыі.

Вядома, што ў сферы мастацкай адукацыі існуюць скептычныя адносіны да праблемы стандартызацыі. Нярэдка спасылаюцца на "кансерватыўную" прыроду вышэйшых навучальных установ, і ў прыватнасці кансерваторый і акадэмій. Лічаць, што навучальныя ўстановы гэтага тыпу як носьбіты сталых традыцый і каштоўнасцей у пэўным сэнсе супрацьстаяць пераменам.

Сфарміраваная яшчэ ў 30-я гады класічная сістэма мастацкай адукацыі не зведала істотных змен. Захаваліся традыцыйныя ў сваёй аснове методыкі выкладання, сродкі і арганізацыйныя формы навучання. Важна тое, што класічная сістэма адукацыі фарміравалася паводле прынцыпаў назапашвання культурна-гістарычнага вопыту, яго адбору, сістэматызацыі ў адпаведнасці з ідэаламі і крытэрыямі мастацтва. Спецыфіка адукацыі заключаецца ў пераемнасці педагагічнай думкі, традыцыях, якія сфарміраваліся ў дзейнасці розных пакаленняў. Адсюль стабільнасць, цэласнасць сістэмы, што базіруецца на аснове ўстойлівага комплексу ідэалаў, нормаў, каштоўнасцей, імкнення да збалансаванасці розных бакоў адукацыі — прафесійнай і агульнагуманітарнай, навукова-тэарэтычнай і практычнай.

У апошні час у вызначэнне мастацкай сістэмы адукацыі ўвайшло такое паняцце, як элітарнасць адукацыі, што ўключае адасобленасць, недаступнасць яе для ўсіх.

Таму кіраванне адукацыяй, яе ўдасканаленне, рэфармаванне эфектыўныя толькі ў выпадку, калі яны не супярэчаць яе спецыфічным асаблівасцям. Гэтыя адметныя рысы заключаюцца ў:

1) тэндэнцыі да менш жорсткай дзяржаўнай каардынацыі і большай інстытуцыйнай аўтаноміі, калі галоўнае кіраванне ажыццяўляецца ў навучальнай установе;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2) змяншэнні кантролю і ўмяшання з боку міністэрства, у большай незалежнасці і самастойнасці вышэйшай навучальнай установы.

Пераход ад уніфікацыі ў сістэме адукацыі да сітуацыі свабоднага творчага функцыянавання з'яўляецца асноўным прынцыпам, звязаным са стандартызацыяй у сферы адукацыі.

Як вядома, структура стандарта не можа заставацца аднасастаўнай, а змест узроўню адукацыі не можа абмяжоўвацца адукацыйным мінімумам. Такім чынам, адукацыйны стандарт прадугледжвае двухсастаўную структуру: асноўны і дадатковы матэрыял.

Усё гэта патрабуе індывідуальнага падыходу да прафесійнай падрыхтоўкі спецыяліста, гнуткасці і варыятыўнасці вучэбных планаў і праграм, іх дыферэнцыяцыі, ранняй і паглыбленай спецыялізацыі. У структуры сістэмы вышэйшай адукацыі асаблівую ролю адыгрывае спецыялізацыя, якая дазволіць сканцэнтраваць увагу на індывідуальнай падрыхтоўцы спецыялістаў.

Такім чынам, стандарт адукацыі павінен даваць адукацыйнай сістэме права на фарміраванне індывідуальных адукацыйных праграм, свабоду ў выкладанні і навучанні. Стандарт замацоўвае і права вышэйшых навучальных устаноў на свабоду выбару адукацыйных праграм, што найбольш адпавядаюць іх магчымасцям і традыцыям. Неабходна лічыцца з тым, што адным з прынцыпаў распрацоўкі дзяржаўнага стандарта з'яўляецца гістарычная пераемнасць з традыцыйнымі для айчыннай вышэйшай школы акадэмічнымі нормамі фарміравання структуры і зместу вышэйшай адукацыі.

Аналіз айчыннага і замежнага вопыту кіравання якасцю паказвае: адной з найбольш складаных праблем з'яўляецца стварэнне сістэмы комплекснай ацэнкі якасці падрыхтоўкі выпускнікоў, адпаведнай абгрунтаванаму набору крытэрыяў. Міжнароднае супрацоўніцтва ў гэтай галіне канцэнтруецца вакол абмеркавання і вывучэння крытэрыяў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

параўнальнасці пытанняў вышэйшай адукацыі ў розных краінах.

Крытэрыі — гэта адметныя адзнакі, з дапамогай якіх могуць быць вызначаны рысы падабенства і адрознення. Па сваёй прыродзе яны бываюць колькасныя, структурныя, якасныя. Іх распрацоўка і ўжыванне могуць быць дасягнуты ў выніку навуковага аналізу і навуковага абмену меркаваннямі.

У 80-я гады ў аснову сістэмы дыягностыкі і аналізу навучальных устаноў быў пакладзены якасны крытэрый. Час паказаў, што сусветная адукацыйная сістэма паўстала і перад неабходнасцю стварэння механізму знешняга кантролю якасці. Сістэма такога тыпу, распрацаваная ў Свабодным універсітэце Амстэрдама, уключае крытэрыі якаснага ўзроўню падрыхтоўкі абітурыентаў, узроўню выкладчыцкага складу і выпускнікоў.

У шырокім сэнсе пад комплекснасцю ацэнкі выпускніка разумеюць сістэмнае аб'яднанне ўсіх вылучаных яе кампанентаў.

Пры комплекснай ацэнцы з улікам тэорыі і практыкі ацэнцы павінны падлягаць наступныя грані якасці падрыхтоўкі выпускнікоў:

1) ведамасная — дзейнасная;
2) патэнцыял — вынікі дзейнасці;
3) рэпрадуктыўная — творчая;
4) дзейнасць індывідуальная — калектыўная;
5) спецыялізацыя ў вузкай галіне — шырокі профіль.

Кожная з іх у ідэале павінна знаходзіцца ў гарманічным балансе, кампрамісе з іншай. Акцэнт, ссоўванне ў бок узмацнення адной з іх вызначаецца ў канкрэтным дзяржаўным стандарце і адпаведных яму адукацыйных праграмах у залежнасці ад напрамку падрыхтоўкі, спецыяльнасці, віду дзейнасці. Дзеля вырашэння задачы комплекснай ацэнкі якасці падрыхтоўкі выпускнікоў важна мець магчымасць ацэнкі ўсіх гэтых граняў.

Адной з галоўных задач стандартызацыі адукацыі з'яўляецца распрацоўка аб'ектыўнага крытэрыю яе ацэнкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Найбольш распаўсюджаным і даўно замацаваным у гэтай сувязі лічаць гэтак званы метад кампетэнтных суддзяў, рэйтынг. Пад ім разумеюць спосаб ацэнкі або псіхалагічнага вымярэння, заснаванага на меркаваннях ужо згаданых кампетэнтных суддзяў.

У мастацтве, дзе вялікае значэнне мае паняцце школы, працэс ацэнкі адукацыйнага ўзроўню зыходзіць ад педагога-майстра, якога належыць у першую чаргу залічаць у шэрагі кампетэнтных суддзяў.

Эфектыўнасць рэйтынгу ў сістэме мастацкай адукацыі павінна грунтавацца на прынцыпе аб'ектыўнасці. Ён звязаны з наступнымі правіламі:

1) выразнасць і дакладнасць фармулёўкі якасці, што падлягае ацэнцы;

2) якасць, што ацэньваецца, павінна ўяўляць дакладна вызначаную адзінку;

3) якасці мусяць падлягаць іерархічнасці, што выбудоўваецца ў адпаведнасці з агульнапрынятымі каштоўнасцямі;

4) ацэнку варта рабіць не толькі на падставе мінулых і сучасных дасягненняў, але і з улікам перспектывы развіцця якасцей, што ацэньваюцца;

5) кожная якасць мусіць характарызаваць пэўную канкрэтную прафесійную рысу асобы.

Такім чынам, структура рэйтынгу ўключае такія кампаненты:

— пералік якасцей навучання (ведаў, уменняў, навыкаў, узроўню развіцця здольнасцей), што ацэньваюцца;

— мадэль крытэрыю ацэнкі, на якой грунтуецца меркаванне кампетэнтных суддзяў.

Вельмі важным у працэсе стандартызацыі аказваецца прынцып апярэджвання. Яго рэалізацыя абапіраецца на апераджальную падрыхтоўку выкладчыцкага, прафесарска-выкладчыцкага складу, спецыялістаў вышэйшай навуковай кваліфікацыі. Яе рэалізацыя ў вышэйшай школе звязана таксама з развіццём фундаментальных і прыкладных даследаванняў на базе ВНУ, перарастаннем навучальнага



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

працэсу ў навукова-даследчы. Гаворка ідзе аб стварэнні на базе вышэйшых навучальных устаноў спецыялізаваных навукова-даследчых падраздзяленняў, арыентаваных на вывучэнне праблем той ці іншай мадэлі ВНУ. Гэта з'яўляецца важным момантам сферы вышэйшай адукацыі, таму што існаванне падобных падраздзяленняў дазволіць паставіць на навуковую аснову ўвесь навучальны працэс.

Стварэнне падраздзяленняў такога кшталту выклікана неабходнасцю асэнсавання рэальнасці адукацыі, што з'яўляецца новым падыходам, а эфектыўнасць вывучэння адукацыі вызначаецца развіццём здольнасці да праблемнага бачання яе працэсаў. Таму дзейнасць падраздзяленняў мае на мэце стварэнне не ідэальных канцэпцый, а праграмы спрыяння разгортванню мадэлі вышэйшай адукацыі, якая будзе вызначаць арганізацыю навучання і спосабы яго рэгламентацыі грамадствам, дзяржавай, асобай.

Працэс стандартызацыі мастацкай адукацыі будзе эфектыўны тады, калі ўсе яго прынцыпы здзейсняцца на практыцы і не будуць мець палавінчатага характару.

**Б.І.Бранавіцкі**, *прафесар*

## МЕСЦА ТЭОРЫІ Ў ПРАКТЫЦЫ ВЫКЛАДАННЯ ЗАМЕЖНАЙ МОВЫ

Навучанне дарослых ангельскай мове — language learning (у адрозненне ад словазлучэння language acquisition, што абазначае авалодванне роднай мовай прыродным шляхам) — на працягу доўгага часу было як бы высвятленнем адносін паміж лінгвістыкай і методыкай. Змены ў метадах навучання замежным мовам адбываліся па меры таго, як змянялася лінгвістычная аснова. Але методыка была і застаецца больш кансерватыўнай. Калі ў XVIII ст. сучасныя мовы пачалі ўключацца ў вучэбныя планы еўрапейскіх школ замест лацінскай мовы, методыка навучання гэтым мовам заставалася ранейшай. Інакш кажучы, адсутнічала